УДК 94(476)

# МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СТАХАНАЎЦАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР (1935–1941 гг)

***Аляксандр Субоцін***
*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Віцебск, Беларусь*

Аўтар асвячае праблему матэрыяльна-бытавога становішча стаханаўцаў сельскай гаспадаркі БССР у 1935–1941 гг. Разглядающца пытанні грашовага стымулявання працы, харчовага забеспячэння, бытавога абслугоўвання і арганізацыі адпачынку гэтай катэгорыі перадавікоў. Робіцца выснова, што палітыка паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча стаханаўцаў у калгасах і саўгасах стала важным стымулам для разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы

***Ключавыя словы: паўсядзённае жыццё, стаханаўскі рух, стаханаўцы, сельская гаспадарка, БССР***

Разгортванне ў БССР стаханаўскага руху, які зарадзіўся ў 1935 г., паспрыяла не толькі карэнным зменам у павышэнні прадукцыйнасці працы, але і фарміраванню асобнай сацыяльнай катэгорыі сярод працоўных – стаханаўцаў. Дадзеная група перадавікоў павінна была служыць эталонам дасканалай працы і высокага ўзроўню паўсядзённага жыцця. У сувязі з чым дзяржава імкнулася падтрымаць высокі сацыяльны статус удзельнікаў стаханаўскага руху за кошт паляпшэння іх матэрыяльнага становішча і выдатнай арганізацыі вольнага часу.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца вызначэнне асаблівасцяў матэрыяльна-бытавога забеспячэння перадавікоў БССР у 1935–1941 гг. на прыкладзе стаханаўцаў сельскай гаспадаркі.

Акрамя маральных стымулаў разгортвання стаханаўскага руху, звязаных з прызнаннем за працоўнымі іх знакавай ролі ў жыцці грамадства, немалаважным фактарам уключэння ў гэтую форму сацыялістычнага спаборніцтва была матэрыяльная ўзнагарода. У развіцці стаханаўскага руху партыйнае кіраўніцтва бачыла не толькі аснову для павышэння прадукцыйнасці працы, але і магчымасці для стварэння заможнага жыцця, паляпшэння быту рабочых і калгаснікаў. І. Сталін на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў адзначаў: “Некоторые думают, что социализм можно укрепить путём некоторого материального поравнения людей на базе бедняцкой жизни. Это не верно.… На самом деле социализм может победить только на базе высокой производительности труда, более высокой, чем при капитализме, на базе изобилия продуктов и всякого рода предметов потребления, на базе зажиточной и культурной жизни всех членов общества. Но для того, чтобы социализм мог добиться этой своей цели и сделать наше советское общество наиболее зажиточным, – необходимо иметь в стране такую производительность труда, которая перекрывает производительность труда передовых капиталистических стран” [1, с. 364]. Зыходзячы з гэтага, меркавалася, што ва ўмовах адмены карткавай сістэмы кожнаму чалавеку будуць даступныя прадукты спажывання ў адпаведнасці з выкананай ім працай, і менавіта за кошт актыўнай вытворчай дзейнасці ён зможа стаць заможным. У такім рэчышчы стаханаўцы як прадстаўнікі грамадства з самымі лепшымі вытворчымі паказчыкамі павінны былі першымі дасягнуць высокага матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця, што становіцца ключавой задачай дзяржаўнай палітыкі.

Асноўным даходам савецкіх працоўных 1930-х гг. была заработная плата. Сярод стаханаўцаў сельскай гаспадаркі гэты інструмент матэрыяльнага заахвочвання адыгрываў ключавую ролю ў саўгасах, дзе ўкараняецца здзельная сістэма аплаты працы па выніках перавыканання колькасных і якасных паказчыкаў вытворчасці. Так, заработная плата стаханаўца Ражаева з саўгаса “Арловічы” Віцебскага раёна за кастрычнік 1935 г. узрасла на 30 рублёў і складала 110 рублёў [2, арк. 6]. Да разгортвання стаханаўскага руху месячны заробак работніцы Гуцавай (саўгас імя Ланге Добрушскага раёна) складаў 80

рублёў, у выніку ж павышэння ёю тэмпаў працы больш чым у 2 разы дасягнуў у маі 1936 г. 183 рублёў [3, с. 33].

У калгасах стаханаўская праца сялян прыводзіла да павелічэння колькасці выкананых імі працадзён, што адпаведна аплачваліся большымі сумамі грошай. У 1936 г. стаханаўка Шыло (калгас імя Леніна Бабруйскага раёна) за 700 працадзён атрымала грашовую аплату у памеры 1000 рублёў [4, арк. 27], а стаханаўская праца калгасніцы Альховік (Клічаўскі раён) за 1939 г. была аплачана 1500 рублямі [5, с. 16]. У некаторых калгасах пры аплаце працы стаханаўцаў назіралася спроба ўстанавіць здзельна-прагрэсіўную сістэму. Так, напрыклад, у калгасе “Брыгадзір” Аршанскага раёна ў 1936 г. была ўстаноўлена сістэма грашовай аплаты ў залежнасці ад працэнта перавыкананых норм пры зборы льну: за апрацаваную звыш нормы 0,01 га калгаснікам выплачвалі 50 капеек, за 0,02 га – 1 рубель, за 0,03 га – 3 рублі, за 0,04 га – 4 рублі і г. д. [6, с. 9]. Безумоўна, грашовая аплата працы стаханаўцаў сельскай гаспадаркі была нашмат ніжэй, чым, напрыклад, стаханаўцаў прамысловасці, аднак на вёсцы і такія выплаты былі моцным стымулам для далейшага ўдасканалення вытворчасці.

Адным з прывілеяў, якія атрымлівалі стаханаўцы, можна назваць вылучэнне ім грашовых дапамог і датацый ад прафсаюзаў і кіраўніцтва гаспадарак для вырашэння бытавых праблем. Так, у студзені 1938 г. Беларускі рэспубліканскі камітэт Саюза мясамалочных саўгасаў вылучыў стаханаўцы Крошкінай (саўгас “Адаменкі”) матэрыяльную дапамогу ў суме 300 рублёў для пакупкі каровы ва ўласную гаспадарку [7, арк. 4].

Стаханаўцы сельскай гаспадаркі, дзякуючы грашовым выплатам за выдатную працу, змаглі набыць сабе вялікі шэраг рэчаў побыту. У 1936 г. стаханаўка М. Ляшкова (саўгас “Пяскі” Гомельскага раёна) на вылучаныя кіраўніцтвам 1000 рублёў купіла сабе канапу, стол, 2 крэслы, шафу, гардзіны і іншыя рэчы [8, с. 26]. За 1937–1938 гг. стаханавец калгаса “Чырвоны партызан” Мінскага раёна Я. Мурашка купіў патэфон, швейную машынку, шафу, 10 венскіх крэслаў, 2 ложкі [9, с. 27–28].

Асаблівасцю паўсядзённага жыцця стаханаўцаў сельскай гаспадаркі можна назваць выдачу ім за іх выдатную працу прамысловых тавараў. На вёсцы праблема з іх пастаўкай у гандлёвыя кропкі стаяла больш востра, чым у горадзе, больш таго, стаханаўцы сельскай гаспадаркі не мелі такіх вялікіх грашовых сродкаў для іх набыцця, як стаханаўцы прамысловасці. Таму амаль кожны стаханавец калгаса ці саўгаса ў якасці прэміі атрымліваў рознага роду рэчы, неабходныя ў побыце. Падчас правядзення акруговага злёту стаханаўцаў земляробства Полаччыны 4–6 студзеня 1936 г. усе лепшыя перадавікі атрымалі прэміі ў выглядзе прамысловых тавараў. Напрыклад, стаханаўка А. Гендзелева была прэміравана швейнай машынкай, стаханавец І. Еронька – мужчынскім касцюмам, А. Яфімаў – мужчынскай кашуляй і джэмперам, А. Сямашка – сукенкай і джэмперам [10, арк. 264–265].

Паляпшэнне харчовага забеспячэння было асноўным стымулам удасканалення працоўнай дзейнасці стаханаўцаў сельскай гаспадаркі, і аплата за перавыкананыя нормы тут ажыццяўлялася галоўным чынам прадуктамі харчавання. Так, стаханаўцы калгасаў, якія перавыконвалі ў некалькі разоў вытворчыя паказчыкі і выпрацоўвалі большую колькасць працадзён, атрымлівалі адпаведна і большую колькасць прадуктаў. У 1936 г. стаханавец А. Лапко (калгас “Чырованая Бярэзіна” Бабруйскага раёна) атрымаў 1440 кг збожжа, 6400 кг бульбы, 1200 кг агародніны і 400 кг садавіны [4, арк. 27]. У тым жа годзе стаханавец А. Авер’янцаў з Буда-Кашалёўскага раёна атрымаў па выніках стаханаўскай працы 55 пудоў збожжа і 62 пуды бульбы [11, арк. 38, 38 адв.], брыгадзір стаханаўскай брыгады А. Сафронаў з Гомельскага раёна – 72 пуды збожжа і 144 пуды бульбы [11, арк. 77, 77 адв.]. Харчовае забеспячэнне ў сельскай гаспадарцы адыгрывала і ролю своеасаблівай прэміі. У Лепельскай акрузе стаханаўцы атрымлівалі ў калгасах у 1935 г. па 60–75 пудоў хлеба авансам [12, арк. 260].

Вялікае значэнне стымуляванне стаханаўскай працы ў выглядзе харчавога забеспячэння мела і для рабочых саўгасаў. Так, за 1935 г. лепшы стаханавец саўгаса “Лучыцкі” (Быхаўскі раён) У. Заіка у дадатак да зробленых 1099 рублёў атрымаў 472 кг

Репозиторий Полесгу

збожжа [11, арк. 79], а для стаханаўкі А. Гуцавай з Добрушскага раёна саўгас вясной 1936 г. спецыяльна засеяў 0,10 га бульбы [3, с. 33].

Характэрнай рысай стаханаўскага руху ў сельскай гаспадарцы становіцца тое, што ў ім удзельнічалі ў некаторых выпадках цэлыя сем'і. Гэта абумоўлівалася занятасцю іх членаў на вытворчых аперацыях у адным і тым жа паляводчым звяне. У выніку павышаная норма прадуктаў харчавання размяркоўвалася цалкам на сялянскую сям'ю, што калектыўна паказвала стаханаўскія тэмпы працы. Так, у 1935 г. у калгсе імя Р. Люксембург Кармянскага раёна сям'я стаханаўцаў Ефрэменка (муж і жонка) выпрацавалі разам 715 працадзён, за што атрымалі 19,4 пуда збожжа, 97 пудоў бульбы, 9 пудоў агародніны [11, арк. 163]. У сям'і калгасніка Глобава (Лёзненскі раён) стаханаўцамі акрамя яго самаго былі таксама жонка і сын. Цалкам яны выпрацавалі за 1937 г. 1300 працадзён і атрымалі за гэта на ўсю сям'ю 3250 кг хлеба і 6500 кг бульбы [12, с. 3]. Падобнае матэрыяльнае заахвочванне атрымала і стаханаўская сям'я Тамашэвіч (Аршанскі раён): у 1938 г. ёй было вылучана за выкананыя 1114 працадзён 178 пудоў зерня і 417 пудоў бульбы [13, с. 3].

Вынікам матэрыяльнай падтрымкі стаханаўцаў сельскай гаспадаркі можна назваць рост дабрабыту іх прысядзібных уласных гаспадарак. Напрыклад, стаханаўка Крукава (калгас імя Сталіна Сіроцінскага раёна) на 1936 г. мела на ўласным падворку карову, цялё, 2 авечкі, свінню і дробную жывёлу [14, с. 13]. Ва ўласным карыстанні стаханаўца Глобава ў 1937 г. знаходзіліся 2 каровы, 4 аўцы, 12 парасят і хатняя птушка [12, с. 3]. Паляпшэнне матэрыяльнага стану ўласных гаспадарак стаханаўцаў тлумачылася зробленымі дзяржавай саступкамі калгаснікам пасля прыняцця і выдання Узорнага статута сельскагаспадарчай арцелі ў лютым 1935 г., згодна з якім членам калгаса дазвалялася ў вызначаных мерах утрымліваць хатнюю жывёлу і вылучаліся ўчасткі зямлі для ўласнага карыстання памерам да паўгектара, а ў некаторых раёнах – да 1 гектара [15, с. 521]. Рэалізацыя адзначанай палітыкі супала па часе з разгортваннем стаханаўскага руху, таму менавіта на прыкладах стаханаўцаў як новай працоўнай эліты вёскі мясцовыя ўлады імкнуліся паказаць ўзорнае выкананне статута на практыцы. Так, у гаспадарках стаханаўцаў БССР былі яскрава прадстаўлены нормы ўтрымання жывёлы, абазначаныя ў дадзеным дакуменце.

Пэўныя перавагі ў паўсядзённым жыцці стаханаўцаў можна прасачыць пры атрыманні паслуг санаторна-курортнага адпачынку. Галоўным чынам такі прывілеі былі атрыманы стаханаўцамі з машынна-трактарных станцый і саўгасаў. Так, у студзені 1936 г. 9 стаханаўцаў з Дзяржынскай, Капыльскай і Слуцкай МТС пазачаргова атрымалі бясплатныя пуцёўкі на курорты ў Кіславодск і Звенігарад, а ў дамы адпачынку з гэтых станцый паехала 5 перадавікоў. Усяго за студзень 1936 г. на усесаюзных курортах і ў санаторыях з БССР адпачыла 72 стаханаўцы МТС [16, с. 4]. У анкетах, што запаўняліся рабочымі саўгасаў для атрымання пуцёвак на курорты і ў санаторыі, можна было сустрэць абавязковую графу аб тым, ці з'яўляецца прэтындэнт на пуцёўку стаханаўцам або ўдарнікам [17, арк. 136]. На аснове такіх анкет у 1937 г., напрыклад, ў працэсе вылучэння пуцёвак на курорты па мясамалочных саўгасах БССР першачаргова складаліся спісы стаханаўцаў. Затым спісы накіроўваліся ў раённыя адборачныя камісіі, што канчаткова вызначалі імёны перадавікоў, якія паедуць адпачываць на курорты [18, арк. 34]. У 1936 г. на адзін з саўгасаў Гомельскага раёна было вылучана 7 пуцёвак, дзе 1 пуцёўка была разлічана для адпачынку на курорце і прызначалася для ўдзельніка стаханаўскага руху [19, арк. 120]. Па Віцебскім раёне ў снежні 1935 г. ад Саюзмалтрэста ў дом адпачынку планавалася накіраваць толькі аднаго, самага лепшага стаханаўца [20, арк. 58].

Праз нізкі ўзровень сацыяльна-бытавога забеспячэння калгаснікаў у параўнанні з рабочымі і адсутнасць у калгасах прафсаюзных арганізацый на гэтыя гаспадаркі прыходзілася невялікая колькасць пуцёвак, і абсалютную іх большасць атрымлівалі менавіта ўдзельнікі стаханаўскага руху. Так, у Жыткавіцкім раёне вясной 1938 г. у санаторыі БССР і на курорты Азоўскага мора на льготных умовах мясцовай адміністрацыяй былі адпраўлены толькі тыя калгаснікі, што паказалі стаханаўскія прыклады працы [21, с. 4]. У большасці выпадкаў пуцёўкі для правядзенне курортна-санаторнага адпачынку калгаснікі вымушаны былі набываць за ўласны кошт, што зноў-

такі маглі зрабіць пераважна стаханаўцы, дзякуючы іх шырокай грашовай падтрымцы з боку дзяржавы. Напрыклад, у маі 1938 г. калгасніцы-стаханаўкі Капароўская і Фальковіч з сельскагаспадарчай арцелі "Труд" набылі пуцёўкі ў санаторыі коштам па 750 рублёў за ўласныя грошы [22, с. 4]. Усё гэта вызначала становішча стаханаўцаў у калгасах як сапраўды прывілеяванае сярод астатніх іх членаў, што не мелі магчымасці атрымаць нават элементарныя ўмовы для адпачынку. Акрамя таго, адпачынак для стаханаўцаў калгасаў спецыяльна арганізоўваўся ў раённых дамах калгасніка. Напрыклад, Лёзненскі раённы выканаўчы камітэт 25 снежня 1935 г. накіраваў у адзін з такіх дамоў 25 лепшых стаханаўцаў, сярод якіх былі вядомыя на ўсю рэспубліку перадавікі льнаводства – Быкоўская, Пярцова, Кавалёва. [23, с. 4].

Такім чынам, асаблівасцямі матэрыяльна-бытавога забеспячэння стаханаўцаў сельскай гаспадаркі БССР стала павышэнне грашовай аплаты іх працы, забеспячэнне дэфіцытнымі таварамі, а таксама павышэння нормаў харчовага забеспячэння па выніках высокіх паказчыкаў працы, што стала ключавым фактарам матэрыяльнага стымулявання працы. У той жа час такія паляпшэнні матэрыяльнага становічша стаханаўцаў можна лічыць толькі задавальннем самых элементарных паўсядзённых патрэб. Стаханаўцы сельскай гаспадаркі ў параўнанні з іншымі працоўнымі мелі перавагу пры арганізацыі санаторна-курортнага адпачынку, дзе атрымлівалі пазачароговыя пуцёўкі або грашова падтрымліваліся дзяржавай для іх набыцця.


1. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц-стахановцев. 14−17 ноября 1935 г. : стеногр. отчёт. − М. : Партиздат ЦК ВКП(б), 1935. – 397 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 932. Воп. 1. Спр. 349.
3. Гуцава, Г. П. За 4000 літраў малака ад каровы / Г. П. Гуцава. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1937. – 36 с..
4. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Ф. 2952. Воп. 1а. Спр. 407.
5. Сідаровіч, М. Стаханаўская праца аплачваецца багата // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1940. – № 2. – С. 16.
6. За 26-ы нумар ільновалакна / С. Палітыка [і інш.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 34 с.
7. Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 173.
8. Лешкова, М. П. Как я добилась 145 яиц на курицу / М. П. Лешкова. – Минск : Гос. изд-во Беларуси, 1936. – 37 с.
9. Міклуш, С. К. Высокі ўраджай – заможнае жыццё / С. К. Міклуш. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1939. – 31 с.
10. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Ф. 104. Воп.1 Спр. 92.
11. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10790.
12. Наши лошади в борозне не станут // Совет. Белоруссия. – 1938. – 20 февр. – С. 3.
13. Красновский, З. Богатый трудодень / З. Красновский // Совет. Белоруссия. – 1939. – 28 февр. – С. 3.
14. Стаханаўкі льнаводства БССР : [зб.]. – Мінск : Белпартвыд-ва ЦК КП(б)Б, 1936. – 35 с.
15. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. 1917–1967 гг. : сб. док. за 50 лет : в 5 т. / сост.: К. У. Черненко, М. С. Смиртюкова. – М. : Политиздат, 1967–1968. – Т. 2 : 1929–1940 гг. / сост.: К. У. Черненко, М. С. Смиртюкова. – 1967. – 454 с.
16. Стаханаўцы МТС – на курорты і ў дамы адпачынку // Звязда. – 1936. – 9 студ. – С. 4.
17. НАРБ. – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 136.
18. НАРБ. – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 135.
19. НАРБ. – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 134.
20. ДАВВ. − Ф. 932. Воп.1. Спр. 460.
21. Колхозники едут на курорты // Совет. Белоруссия. – 1938. – 23 марта. – С. 4.
22. Колхозники приобретают путёвки на курорты // Совет. Белоруссия. – 1938. – 10 мая – С. 4.
23. Стаханаўцы на адпачынку // Звязда. – 1935. – 27 снеж. – С. 4.


## MATERIAL WELFARE OF THE AGRICULTURAL STAKHANOVISTS OF THE BSSR (1935–1941)

Репозиторий ПолесГУ

***Aliaksandr A. Subotsin***
*PhD, Vitebsk State technological university, Vitebsk, Belarus*
subotsin@mail.ru

**Summary:** The author highlights the problem of material welfare of the agricultural Stakhanovists of the BSSR in 1935–1941. The issues of material support and organization of rest of this category of pace-makers are considered. It was concluded that policies to improve the material welfare of the Staknanovists was a significant incentive for development of the socialist competition in agriculture

***Keywords: everyday life, Stakhanov movement, Stakhanovists, agriculture, BSSR***

Репозиторий ПолесГУ